**Роналд Нокс**
(Ronald Knox)

# Дзесяць запаветаў дэтэктыўнай літаратуры
(10 Commandments of Detective Fiction)

1. Злачынцу варта ўвесці ў пачатку твора, але ім не павінен аказацца герой, чые думкі чытач можа адсочваць.

2. Усе звышнатуральныя і ненатуральныя дзеянні варта адразу выкрасліць.

3. Можна выкарыстоўваць не больш за адзін патаемны пакой ці праход.

4. Не дапускаецца выкарыстанне невядомых на час дзеяння твора атрутаў або прыстасаванняў, якія вымагаюць доўгага тлумачэння ў канцы.

5. Ніякіх кітайцаў у рамане.

6. Дэтэктыву не можа дапамагчы выпадак, а таксама невытлумачальныя падказкі інтуіцыі, што пасля спраўджваюцца.

7. Дэтэктыў не можа сам здзейсніць злачынства.

8. Калі дэтэктыў натрапіў на якія-кольвек доказы, яны мусяць адразу стаць вядомыя чытачу.

9. Дурны сябар дэтэктыва (Ўотсан) не павінен хаваць свае думкі. Яго розум мусіць быць крыху слабейшым, чым у звычайнага чытача, але толькі крыху.

10. Блізнятам і двайнікам звычайна не варта з’яўляцца ў творы, калі толькі мы не былі падрыхтаваныя да іх з’яўлення.

*пераклад з ангельскай* — Юля Цімафеева

© Юля Цімафеева, пераклад, 2012